**Грабянчук Ігар Васільевіч**
кандыдат гістарычных наук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі
і сацыяльных навук
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
ivgr7@mail.ru

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі
і сацыяльных навук
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
aleksander.g.t@gmail.com

# «ВОБРАЗ ВОРАГА» Ў ІДЭАЛАГІЧНЫМ І ІНФАРМАЦЫЙНЫМ СУПРАЦЬСТАЯННІ НАПЯРЭДАДНІ І ПАДЧАС ЗІМОВАЙ ВАЙНЫ 1939–1940 ГГ.

Статья посвящена изучению конструированию образа врага в советской и финляндской пропаганде в период зимней войны 1939–1940 гг. Показаны основные методы и средства используемые в пропагандистском дискурсе. Проведен анализ основных нарративов в инормационно-пропагандистском противостоянии сторон. Авторы приходят к выводу, что если в советской пропаганде доминировали классовые мотивы, то в финской на первом плане были патриотические и националистические нарративы.

Ключевые слова: *зимняя война*; *пропаганда*; *образ врага*; *информационное противостояние.*

*Уводзіны*

Шырокае выкарыстанне прапаганды і маніпулявання грамадскай свядомасцю заўсёды актыўна ўплывалі на камунікатыўную прастору вайны, але ў XX ст. інфармацыйна-псіхалагічнае супрацьстаянне выйшла на першы план у канфліктах.

Пад прапагандай мы будзем разумець адкрытае мэтанакіраванае распаўсюджванне пэўных ідэй, каштоўнасцей, поглядаў, аргументаў, фактаў, норм, праграм паводзін і іншых звестак для фарміравання грамадскай думкі, поглядаў, эмоцый ці іншых мэт, якія праследуюцца прапагандыстамі. Розныя віды прапаганды могуць навязваць людзям тыя ці іншыя перакананні для распальвання сацыяльнай ці нацыянальнай варожасці, эскалацыі сацыяльных канфліктаў, абвастрэння супярэчнасцей у грамадстве, абуджэння нізінных інстынктаў у людзей, што дазваляе навязаць масе выгадныя прапагандысту перакананні і стэрэатыпы і тым самым згуртаваць іх вакол сябе. Адной з характэрных рыс негатыўнай прапаганды з'яўляецца тэхналогія стварэння «вобраза ворага» – гранічна спрошчанага, схематызаванага і міфалагізаванага ўспрымання саперніка на аснове этнічных, палітычных, ідэалагічных і іншых стэрэатыпаў. Падчас вайны «вобраз ворага» набывае ўласцівасці ідэалагемы, што непазбежна стварае падвойныя стандарты ў ацэнцы сваіх і чужых дзеянняў – кожны з бакоў узброенага супрацьстаяння апраўдвае сябе і абвінавачвае ва ўсіх грахах саперніка [1, с. 4–7].

У прапагандысцкім дыскурсе вялікую ролю адыгрывае гісторыя, зварот да гістарычнай памяці народа. Гістарычная памяць – гэта мэтанакіравана сканструяваны адносна ўстойлівы набор узаемазвязаных калектыўных уяўленняў аб мінулым той ці іншай групы, кадыфікаваны і стандартызаваны ў грамадскіх, культурных, палітычных дыскурсах, стэрэатыпах, міфах, сімвалах і камемаратыўных практыках.

Метадалагічнай асновай артыкула таксама з'яўляецца актуальны ў сучаснай навуцы падыход гістарычнай імагалогіі (ад лац. imago – вобраз) – міждысцыплінарны накірунак, які паўстаў на сумежжы гісторыі, культуралогіі, літаратуразнаўства, этналогіі, сацыяльнай і гістарычнай псіхалогіі. Імагалогія выступае як накірунак гістарычнай антрапалогіі. У працэсе гістарычнага ўзаемадзеяння народаў і культур ў грамадскай і індывідуальнай свядомасці паўстаюць вобразы «іншых», або «чужых» – іншых культур, народаў, краін і г.д. Гістарычная імагалогія вывучае праблемы фарміравання і існавання нацыянальных і іншакультурных вобразаў у свядомасці сацыяльных і этнічных супольнасцей, асобных індывідаў і груп. У сферу даследаванняў імагалогіі таксама адносяцца сацыяльныя, этнічныя, знешнепалітычныя, культурныя, геаграфічныя стэрэатыпы і вобразы [2, с. 126].

*Вобраз Фінляндыі ў савецкай прапагандзе*

Прапагандысцкая кампанія ў СССР з мэтай маральна-псіхалагічнай мабілізацыі насельніцтва пры падрыхтоўцы да вайны была маштабнай і масіраванай. Асаблівую ролю ў ёй адыгрывала газета «Праўда» – друкаваны орган Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў).

Асноўныя афіцыйныя мэты савецкай прапаганды, скіраванай супраць Фінляндыі, былі наступнымі:

1. Выкрыць фінскіх «падпальшчыкаў вайны», якія не імкнуцца да ўстанаўлення трывалых і добрасуседскіх адносін з СССР.

2. Растлумачыць мэты магчымай вайны і адначасова міралюбную знешнюю палітыку СССР.

«Праўда» і іншыя газеты старанна стваралі вобраз «савецкага салдата-вызваліцеля» і надавалі фінскім войскам «белагвардзейскі выгляд». Папярэдняя тэрміналогія пра «фінскіх фашыстаў» сышла з савецкага прапагандыскага лексікону ў сувязі са зменай характару савецка-германскіх адносін пасля падпісання сумна вядомага пакта Молатава-Рыбентропа 23 жніўня 1939 г. Прапагандысцкімі штампамі сталі такія выразы, як «бела-Фінляндыя» (менавіта ў такім арфаграфічным рэжыме сустракаецца гэта паняцце на старонках «Праўды»), «фінская белагвардзейшчына», «белафінскія бандыты» і г.д. [3, с. 80].

У савецкай прапагандзе вобраз ворага ў асобе «бела-Фінляндыі» культываваўся для дзвюх мэтавых аўдыторый. Першая – гэта савецкія вайскоўцы, якіх рыхтавалі да «вызваленчага» паходу ў Фінляндыю. Другой групай было савецкае грамадства ў цэлым («шырокія народныя масы»). У адпаведнасці з гэтым выбіраліся тыя або іншыя метады і сродкі ўздзеяння на аўдыторыю.

Хісткасць юрыдычных і маральных падстаў лічыць вайну з Фінляндыяй справядлівай для СССР не магла не адбіцца на настроях савецкіх войскаў. Дыяпазон меркаванняў у іх быў вельмі шырокі – ад сумневаў у слушнасці дзеянняў савецкага ўраду да адкрыта цынічнай пазіцыі, згодна з якой «моцны заўсёды мае рацыю».

У данясенні Палітупраўлення Ленінградскай ваеннай акругі начальніку Палітупраўлення Чырвонай арміі Л. З. Мехлісу ад 1 лістапада 1939 г. прыводзяцца канкрэтныя прыклады розных настрояў сярод савецкіх вайскоўцаў. Так, чырвонаармеец 323-га артылерыйскага палка Чыхараў казаў: «Финляндия не приняла мирных предложений СССР и этим самым дала понять, что не хочет дружбы. Мы, если понадобится, продвинем границу от Ленинграда не только на десятки, но и на сотни километров» (тут і далей цытаты падаюцца на мове арыгіналу ці апублікаванага перакладу). Іншы вайсковец выказаў думку, якая выклікала занепакоенасць у яго ідэалагічнага начальства: «Младший командир 54-го отд. зен. артдива Полин в беседе заявил: «Зачем СССР настаивать на требованиях в переговорах с Финляндией в отношении территории, ведь Финляндии тоже нужна эта территория. 20 лет она не обстреливала, а если и будет обстреливать, то постреляет и перестанет. Мы ведь японцам не отдали высоты Заозерной. Не являются ли наши требования агрессивными?» [4, с. 136].

Наколькі моцнае ўздзеянне прапаганда рабіла на савецкіх людзей сведчаць шматлікія факты пра тое, што нават сутыкнуўшыся з рэальнай сілай праціўніка і з цяжкімі стратамі, чырвонаармейцы захоўвалі ўпэўненасць у перамозе, у значнай ступені абапіраючыся на стэрэатып аб суадносінах сіл вялікай дзяржавы і маленькай краіны: «…не надо падать духом, все равно победа будет за нами и «козявке» слона не победить» [4, с. 136-138].

Тэма ўзаемаадносін СССР і Фінляндыі пачала рэгулярна з'яўляцца ў газеце «Праўда» напрыканцы кастрычніка – пачатку лістапада 1939 г. Першыя публікацыі мелі стрыманую танальнасць, распавядалі пра краіну ў цэлым, яе праблемы ў эканамічнай і сацыяльнай сферах, класавую барацьбу [5]. Падобныя інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы публікавалі і іншыя газеты, напрыклад, «Звязда», «Чырвоная змена» ў Беларусі.

Па меры таго, як савецка-фінляндскія перамовы аб змяненні дзяржаўнай мяжы паміж дзвюма краінамі заходзілі ў тупік, тон публікацый савецкай прэсы станавіўся ўсё больш варожым і агрэсіўным. Часта гучалі абвінавачванні фінскіх уладаў у антысавецкіх настроях [6; 7]. Тэма «бела-Фінляндыі» пачынае перамяшчацца з апошніх палос савецкіх газет на першыя, паступова займаючы на іх дамінуючае становішча напярэдадні вайны. Вось некалькі найбольш характэрных загалоўкаў: «Наглая провокация финляндской военщины», «Уничтожим врага, если он не образумится!», «Не позволим финской военщине держать Ленинград под угрозой!» і г.д. Яны падмацоўваліся

гучнымі сцвярджэннямі аб савецкай ваеннай магутнасці: «Страна Советов непобедима!», «Красная Армия – несокрушимая сила!». Можна таксама прыгадаць і тэхналогію «расчалавечвання ворага» ў адносінах да прэм'ер-міністра Фінляндыі Айма Каяндэра [8].

Як напярэдадні савецка-фінляндскай вайны, так і ў першыя яе дні, найважнейшым інфармацыйным блокам у «Праўдзе», іншых цэнтральных і рэгіянальных газетах выступалі рэзалюцыі мітынгаў, якія праходзілі на розных прамысловых прадпрыемствах і ва ўстановах па ўсяму Савецкаму Саюзу. Гэты блок выконваў задачы правільнай эмацыйнай афарбоўкі падзей з пункту гледжання пануючай ідэалогіі, надання рашэнням цэнтра агульнанароднай падтрымкі. З пачаткам ваенных дзеянняў эмацыйны напал загалоўкаў у «Праўдзе» значна ўзрос: «Стереть с лица земли зарвавшихся финских бандитов!»; «Единодушное требование советского народа – нанести сокрушительный уничтожающий удар финским поджигателям войны»; «Не просунуть финским свиньям свое рыло в советский огород!».

Не адставалі ад яе і іншыя газеты. Напрыклад, у газеце «Звязда» за 30 лістапада 1939 г. былі змешчаныя нататкі вядомых беларускіх дзеячаў літаратуры і мастацтва – М. Лынькова, П. Броўкі, З. Бядулі, Л. Ржэцкай. Галоўная мэта гэтых публікацый заключалася ў тым, што сваім аўтарытэтам гэтыя добра вядомыя ў БССР людзі павінны былі падмацаваць правільнасць прынятага савецкім урадам рашэння аб вайне з «бела-Фінляндыяй». Назва нататкі П. Броўкі адлюстроўвала агульную танальнасць на дадзеную тэму: «Белафінская бандыцкая зграя загіне пад рашучым і моцным ударам слаўных сыноў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі!». Заўважым, што падобных публікацый вядомых прадстаўнікоў расійскай інтэлігенцыі на старонках «Праўды» не было. Яны публікаваліся ў іншых газетах. Можна, напрыклад, узгадаць верш А. Твардоўскага «Мы еще ждем» [9, с. 29].

Такім чынам, напярэдадні падзей, якія прывялі да развязвання адкрытых баявых дзеянняў, у масавай свядомасці савецкіх грамадзян быў сфармаваны, па-першае, вобраз Фінляндыі, па-ранейшаму расколатай сацыяльнымі супярэчнасцямі на два лагеры як найважнейшае наступства грамадзянскай вайны ў Фінляндыі ў 1918 г. Па-другое, вобраз ворага замацоўваецца за вузкай праслойкай «фінляндскай ваеншчыны», капіталістаў-эксплуататараў і г.д. Яны, у сваю чаргу, займаюцца прыгнётам простага фінскага народа, прычым па ўказцы «сваіх заходніх гаспадароў». Усе гэтыя тэзісы абапіраліся на натуральныя для той эпохі ўстаноўкі: салідарнасць працоўных, намінальнае права народаў на самавызначэнне (у сувязі з тэзісам аб імкненні фінскага народа да сяброўства з СССР).

*Вобраз СССР у фінскай прапагандзе*

З-за геаграфічнай блізкасці і гісторыі Расія ці пазней Савецкі Саюз заўсёды лічыліся галоўнай праблемай бяспекі ў Фінляндыі. Гістарычная памяць фінаў

адносна ўзаемадзеяння з Расійскай імперыя таксама часта была траўматычнай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўдзелу Савецкай Расіі ў Грамадзянскай вайне ў Фінляндыі ў 1918 г. гэтыя адносіны паміж краінамі сталі яшчэ больш праблематычнымі. СССР разглядаўся адзінай пагрозай незалежнасці Фінляндыі як па нацыянальных, так і па палітычных прычынах. Многія фіны абапіраючыся на гістарычны вопыт лічылі як дадзенае, што ўсе расійскія ўрады, незалежна ад іх палітычных поглядаў, будуць імкнуцца вярнуць Фінляндыю проста таму, што Расія была вялікай дзяржавай [10, с. 62].

Зімовая вайна ў Фінляндыі ў пэўным сэнсе была марай любога прапагандыста, якому прызначалася падтрымліваць баявы дух тылу. Задача, з-за палітычных і гістарычных прычын, была дастаткова лёгкай з-за дзеянняў самога СССР і агульнай сітуацыі. Пасля таго, як тыл зразумеў, што барацьба не безнадзейная, падтрымліваць патрыятычны дух нацыі было адносна лёгка. Нават фінскаму камуністу было цяжка паверыць, што фінскія лідары былі настолькі дурныя, каб справакаваць вайну, у якой 3,5 мільёна фінаў змагаліся б ў адзіночку супраць 180-мільённага ворага. У выніку практычна немагчыма было сумнявацца ў афіцыйная пазіцыі, паводле якой Фінляндыя была ахвярай, якая змагалася супраць неспраакаванай, злавеснай атакі [10, с. 57].

Характэрна, што нават у 1930-я гг. шэраг палітычных дзеячаў Фінляндыі лічылі вайну малаверагоднай. Напрыклад, Р. Рыці, прэм'ер-міністр падчас Зімовай вайны, у пачатку 1930-х г. лічыў, што вайны не будзе, таму было б бессэнсоўна выдаткоўваць вялікія сумы на ўзбраенне. Прэм'ер-міністр у 1937–1939 гг. А.К. Каяндэр віншаваў краіну з тым, што яна не купляла зброю, якая была б відавочна састарэлай. Толькі перад пачаткам Другой сусветнай вайны вядучы сацыял-дэмакрат, міністр замежных спраў падчас Зімовай вайны, В. Танер пісаў, што ён не верыць, што будзе яшчэ адна вайна, таму што свет проста не можа стаць такім вар'ятам. Аднак нават такія людзі разглядалі напад СССР на Фінляндыю цалкам магчымым [10, с. 57–58].

У перыяд Зімовай вайны 1939–1940 гадоў фінская прапаганда актыўна выкарыстоўвала вобраз ворага для мабілізацыі нацыянальнай свядомасці і фармаванні адзінага фронту супраць Савецкага Саюза.

Для стварэння вобраза ворага ў фінскай прапагандзе выкарыстоўваліся розныя метады і сродкі. Вялікая ўвага надавалася друкаваным і аўдыёвізуальным сродкам масавай інфармацыі, такім як газеты, часопісы, радыё і кіно. Яны выкарыстоўваліся для распаўсюджвання прапагандысцкіх матэрыялаў і мабілізацыі грамадскай думкі.

Так, на старонках нацыяналістычнага выдання *Uusi Suomi* рускія і асабліва афіцэры Чырвонай Арміі стыгматызаваліся як рабаўнікі і разбуральнікі, нацыя хлусаў, хітрых здраднікаў. На думку газеты самым страшным іх грахом была поўная бездапаможнасць і пакорлівасць, з якой яны сустрэлі бальшавіцкую ўладу [10, с. 69].

Асобная ўвага надавалася так званаму «Тэрыёкскаму ўраду». Стварэнне Масквой канкурыруючага ўраду не падзяліла фінаў. Урад Тэрыёкі не стаў сігналам да пачатку рэвалюцыі, але стаў своеасаблівым «фактарам здрадніцтва»: ён пераканаў практычна ўсіх фінаў, што вайна ідзе не толькі аб змяненні граніцы, але і аб пытанні незалежнасці і свабоды нацыі. Слабы спіс прозвішчаў урада Тэрыёкі не змог пераканаць нават мясцовых камуністаў. Толькі «прэм’ер-міністр» марыянеткавага ўрада Ота Віле Куусінен, адзін з двух ацалелых членаў урада Чырвонай Фінляндыі 1918 года, быў вядомай асобай у Фінляндыі [10, с. 79].

Фінская прапаганда адлюстроўвала вайну як абарону радзімы ад жорсткіх і бязлітасных захопнікаў, якія злучаюць камуністычны рэжым з традыцыйным рускім вялікадзяржаўем. Апеляцыя да гістарычнай памяці фінскага народу была важным элементам ваеннай прапаганды. Так, ў песні «Не, Молатаў!» кіраўнік савецкага ўрада параўноўваўся з царскім генерал-губернатарам Фінляндыі Мікалаем Бобрыкавым, вядомым сваёй палітыкай русіфікацыі і барацьбы з аўтаноміяй Фінляндыі [11].

Фінская прэса прадстаўляла СССР і Расію як спрадвечнага ворага, бязбожную камуністычную сістэму, згадвала фінскіх драгун, што загінулі пад Палтавай і павінны зараз паўстаць як армія прывідаў і далучыцца да барацьбы [12, с. 388]. Праводзіліся гістарычныя паралелі з перыядам фінскай гісторыі вядомым як «вялікае ліхалецце» 1713–1721 гг., калі падчас Паўночнай вайны тэрыторыя Фінляндыі была занята рускімі войскамі. Апынуўшыся ў сітуацыі знешняй агрэсіі вайна прадстаўлялася як гераічная барацьба Давіда супраць Галіяфа [12, с. 387–392].

Асобным кірункам прапаганды з’яўлялася Чырвоная Армія. Фіны выкарыстоўвалі ўлёткі, прамовы па гукаўзмацняльніках і плакаты на нічыйнай зямлі. Большасць фінскіх улётак зроблена фінскімі афіцэрамі, якія вывучалі рускую мову ў дарэвалюцыйнай Расіі або ў Расійскай імператарскай арміі. Нярэдка яны пісалі на дарэформеннай рускай мове, што выглядала чырвонаармейцам дзіўна і, магчыма, толькі ўзмацняла недавер, бо савецкая контрпрапаганда сцвярджала, што ўсе ўлёткі зроблены рускімі эмігрантамі, якія ваявалі супраць бальшавікоў у грамадзянскую вайну.

Некаторыя фінскія ўлёткі асуджалі Сталіна і заахвочвалі чырвонаармейцаў зрынуць уладу Сталіна; іншыя спрабавалі пераканаць чырвонаармейцаў, што Сталін не хоча вайны і што вайну пачалі амбіцыйныя генералы з Ленінградскай ваеннай акругі, каб атрымаць павышэнне. Яшчэ на адзін цікавы аспект адносна персоны І. Сталіна ўказвае сучасная фінская даследчыца С. Вунш. Калі СССР напрыканцы студзеня 1940 г. заявіў аб гатоўнасці весці перамовы аб міры з фінскім урадам, Інфармацыйны цэнтр Дзяржаўнага савета Фінляндыі разаслаў інструкцыю для рэдакцый газет, у якой «лічылася пажаданым», каб Сталіна асабіста не закранаді ў публікацыях і карыкатурах. Неабходнасць такога кроку тлумачылася тым, што поспех перамоваў у першую чаргу залежыць ад

волі савецкага правадыра, таму не трэба яго лішні раз раздражняць. Аднак гэту дырэктыву фактычна выконвалі толькі цэнтральныя газеты: «Поскольку словесные формулировки не были запрещены полностью при затрагивании указанной темы, то в провинциальной прессе персона Сталина обсуждалась в весьма цветистых выражениях, особенно в фельетонах, вплоть до конца войны [12, с. 413].

Значную частку займала прапаганда палону. Улёткі абяцалі сытае і спакойнае жыццё («Через плен – к свободе. У финнов тепло и сытно»). Амаль усе фінскія ўлёткі заклікалі чырвонаармейцаў забіваць сваіх палітрукоў і пераходзіць на фінскі бок. Менавіта палітрукі прадстаўляліся амаль як галоўныя ворагі звычайнага салдата, якія гналі яго на смерць («Политрук хуже врага – он стреляет тебе в спину!» «Политрук – герой Союза, а у тебя пустое пузо!») [13].

Зімовая вайна з'яўлялася адзіным эпізодам Другой сусветнай вайны калі прапаганда імкнулася не толькі запужаць, але і купіць праціўніка. У многіх фінскіх улётках чырвонаармейцам паведамлялася, што ім заплацяць за зброю – ад рэвальвера да танка ці самалёта, калі яны здадуць яе фінскай арміі [14]. Некаторыя фінскія ўлёткі паказвалі генералаў Чырвонай Арміі ў вельмі негатыўным святле. Фінскія ўлёткі таксама звярталіся да пачуццяў чырвонаармейцаў і тлумачылі ім, што фіны ваююць за свае дамы і свае сем'і на сваёй зямлі.

Асаблівасцю ўлётак у Зімовую вайну з'яўляецца тое, што яны друкаваліся на паперы яркага колеру – аранжавай, ружовай, блакітнай, фіялетавай, бо павінны былі быць бачныя на снезе.

Маршал Манэргейм адзначаў у сваіх мемуарах, што фінская прапаганда была безвыніковай: «Чырвонаармейцы былі амаль цалкам неўспрымальныя да нашай прапаганды» [15]. Расійскі даследчык прапаганды ў часы вайны А. А. Іваноў сцвярджае, што фінляндская прапаганда аказалася больш эфектыўна, бо заклікі абараняць свой дом былі для салдата бліжэй і зразумелыя, чым прапагандысцкія фармулёўкі аб пагрозе Савецкаму Саюзу з боку Фінляндыі [10, с. 44].

Такім чынам, напрыканцы 1939 г. савецкая прэса пачала актыўную падрыхтоўку свядомасці савецкага чытача да гіпатэтычнага сілавога вырашэння канфлікту, які звязваўся з цяжкасцямі, якія ўзніклі ў ходзе перагавораў паміж урадамі Фінляндыі і Савецкага Саюза. Вобраз Фінляндыі, створаны ў гэты перыяд, дазволіў рэзка вывесці антыфінляндскую прапаганду на новы ўзровень. Прыёмы і рыторыка газетных артыкулаў і нататак, якія выкарыстоўваліся ў прэсе, адназначна ўскладалі віну за развязаную вайну на Фінляндыю.

Непасрэдную прапаганду ста пяці ваенных дзён можна ахарактарызаваць натуральным імкненнем да ідэалізацыі дзеянняў свайго войска, дэманстрацыі салідарнасці з палітыкай савецкай дзяржавы з боку працоўнага фінскага

народа, культурных і палітычных дзеячаў краін Заходняй і Паўночнай Еўропы. У сваю чаргу, вобраз ворага ў фінскай прапагандзе ў перыяд Зімовай вайны 1939–1940 гг. адыгрываў важную ролю ў фармаванні нацыянальнай ідэнтычнасці фінаў і мабілізацыі грамадскай думкі на абарону дзяржавы. Калі ў савецкай прапагандзе дамінавалі класавыя матывы, то ў фінскай на першае месца выйшлі патрыятычныя і нацыяналістычныя лозунгі. Фінская прапаганда заклікала змагацца супраць бальшавіцкай агрэсіі, але акцэнт рабіла не на класавым характары вайны, а на нацыянальным.

ЛІТАРАТУРА


1. *Иванов, А. А.* Коммуникативное пространство войны: пропаганда и общественные настроения : учеб.-метод. пособие / А. А. Иванов. – СПб., 2017. – 72 с.
2. *Поршнева, О. С.* Историческая имагология в современной российской историографии / О. С. Поршнева // Урал индустриальный. Бакунинские чтения : Индустриальная модернизация Урала в XVIII–XXI вв. : материалы XII Всерос. науч. конф., Екатеринбург, 4–5 дек., 2014 г. : в 2 т. – Екатеринбург : УрФУ, 2014. – Т. 1. – С. 126–129.
3. *Авилкин, А. М.* Основные аспекты развития отечественной историографии советско-финляндской войны 1939–1940 гг. / А. М. Авилкин // Вестн. Воен. ун-та. – 2010. – № 2. – С. 78–83.
4. *Сенявская, Е. С.* Противники России в войнах XX века: Эволюция «образа врага» в сознании армии и общества / Е. С. Сенявская. – М. : РОССПЭН, 2006. – 288 с.
5. Положение в Финляндии // Правда. – 1939. – 13 нояб. – С. 5.
6. Антисоветская кампания в Финляндии // Правда. – 1939. – 24 нояб. – С. 5.
7. Разгул антисоветской кампании в Финляндии // Сов. Бел. – 1939. – 24 нояб. – С. 4.
8. Шут гороховый на посту премьера // Правда. – 1939. – 26 нояб. – С. 1.
9. Принимай нас, Суоми-красавица! «Освободительный» поход в Финляндию в 1939–1940 гг. : сб. док. и фотоматериалов. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб. : Издательство «Остров», 2004. – 290 с.
10. *Vares, V.* Childlike Masses Against True Men Of Valour: The Comical Image Of The Russians In Finland During The Finnish-Soviet Winter War (1939-1940) / V. Vares // Enemy Images in War Propaganda. – 2012. – С. 57–88.
11. Нет, Молотов! // Heninen.net [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: http://heninen.net/njet/index.html. – Дата доступу: 02.04.2023.
12. *Вунш, С.* «Красная угроза». Образ СССР в финской прессе. 1939 – 1940 / С. Вунш; пер. с фин. – СПб. : Европейский дом, 2011. – 462 с.
13. «Нет, Молотов!» – финская пропаганда во время Второй Мировой войны // Военное обозрение [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: https://topwar.ru/28446-finskie-listovki-dlya-sovetskih-soldat.html. – Дата доступу: 02.04.2023.
14. Финны – летчикам-красноармейцам // Арзамас [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: https://arzamas.academy/micro/propaganda/3. – Дата доступу: 02.04.2023.
15. Propaganda in the Winter War // The Winter War of Finland and Russia. Fire and Ice [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: https://media.wfyi.org/fireandice/history/propaganda.htm. – Дата доступу: 02.04.2023.


*Поступила в редакцию 06.04.2023*